Анатоль Разановіч

# Палын-вада

**раман-хроніка**

кніга трэцяя

**Дробны дождж**

Мінск
«Беларусь»
2021



УДК 821.161.3-31
ББК 84(4Беи)44
Р17

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе
і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь*

**Разановіч, А. І.**

Р17 Палын-вада : раман-хроніка. Кн. 3. Дробны дождж / Анатоль Разановіч. — Мінск : Беларусь, 2021. — 399 с.

ISBN 978-985-01-1402-0.

Карфаген павінен быць разбураны — такое рашэнне, як вядома, прынялі старажытныя рымляне. Яны прыклалі ўсе свае сілы і сродкі, каб усталяваць панаванне ў Міжземнаморскім рэгіёне, для чаго знішчылі дзяржаву фінікійцаў са сталіцай Карфаген. Гісторыя паўтарылася. Але ўжо не для збірання земляў у адной дзяржаве, а наадварот — падзелу велізарнай тэрыторыі СССР на 15 суверэнных рэспублік, адна з якой — Беларусь, Суверэнітэт яе адразу ж быў замацаваны ў Канстытуцыі. Першыя гады жыцця беларусаў ужо на постсавецкай прасторы, іх жаданне і імкненне быць самастойнымі, свабоднымі, багатымі — вось тое, што лягло ў аснову трэцяй кнігі «Дробны дождж» рамана-хронікі «Палын-вада».

**УДК 821.161.3-31**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-01-1402-0 (кн. 3)**
**ISBN 978-985-01-1374-0**

© Разановіч А. І., 2021
© Афармленне. РУП «Выдавецтва «Беларусь», 2021

*Дай мне ўсё! Я не стану багатым.*
*Усё вазьмі! Я не стану бядней!*
*Над балотамі птушка заплача.*
*Ноччу стане пясок халадней…*

Ігар Шклярэўскі



# Частка першая

## I

У пачатку лютага прыгожа апранутая сініца плаўна ўзляцела на стары граб, што стаяў у агародзе дзеда Фёдара, агледзелася вакол і заспявала звонкую жыццярадасную песню.

— Глядзі ж ты, — здзівіўся стары, выцягваючы тонкую гужаватую шыю, — цяпла захацела...

Яму і самому ўжо надакучыла зіма, і ён чакаў вясны. Чакаў так, нібы адчуваў, што жыць яму засталося мала. Можа, паўгода ці год — гэта як Бог дасць. Праўда, думкі пра смерць не палохалі дзеда Фёдара: «Пражыў ўжо...» Непакоілі старога смутныя часы, што наступілі пасля развалу СССР. Усё адбывалася не так, як чакалася яму і людзям. Нешта яго трывожыла і прыгнятала. Ад усяго гэтага ўнутры ў дзеда Фёдара ўжо некалькі месяцаў халадзела і балела. Гэтыя холад і боль узмацнялі навіны, што перадавалі па радыё і тэлебачанні. Не слухаць бы іх, але без гэтых навінаў стары цяпер не мог пражыць і дня.

— О-хо-хо! — уздыхнуў дзед Фёдар і ўключыў радыё. Глухі манатонны голас дыктара тут жа выгнаў цішыню і спакой з хаты:

— Прынята пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб рознічных цэнах на мяса і мясапрадукты ў першым квартале 1992 года». У пастанове гаворыцца: «Захаваць дзяржаўнае рэгуляванне рознічных цэн на асноўныя віды мясной прадукцыі і ўсталяваць з 1 лютага 1992 года сярэдні ўзровень цэн пры рэалізацыі насельніцтву: ялавічыны — 46 рублёў, свініны — 48 рублёў, бараніны — 53 рублі, мяса птушкі — 40 і каўбас вараных — 55 рублёў за кілаграм».

— Што ж гэта за час цяпер такі, — абурыўся стары, адчуваючы вышэй жывата ныючы боль. — Цэны пруць наперад, што шалёныя коні. І спыняць іх ніхто не думае. Свініна сорак восем рублёў... Гэта ж колькі дзён на кавалак мяса працаваць трэба?.. Калі такое было?..

З радыёпрыёмніка загучала новая інфармацыя. Не лепш першай.

— Прэм’ер-міністр Беларусі Вячаслаў Францавіч Кебіч выказаўся аб неабходнасці ўвядзення ў нашай рэспубліцы купоннай сістэмы. У гутарцы з нашым карэспандэнтам ён сказаў прама: «Купоны будуць існаваць, бо нас могуць завaліць абясцэненай грашовай масай». Праўда, старшыня Савета Міністраў не растлумачыў, адкуль зыходзіць пагроза, але гэта ясна і без слоў: абясцэненая грашовая маса можа хлынуць у Беларусь з Расіі.

— Вось так, — няпэўна прамовіў дзед Фёдар.

Гэтую грашовую масу, цана якой падае, ён уяўляў сабе ў выглядзе пачарнелага снегу, які ляжыць пад платамі і не спяшаецца раставаць. А вось, што такое купоны, дзед Фёдар не ведаў, таму дадаў у радыё гуку.

— У памяшканні Інстытута тэхнічнай кібернетыкі Акадэміі навук Беларусі адбыліся першыя таргі Беларускай фондавай біржы, — рапартаваў дыктар. — На нашых вачах нараджаецца новая кагорта прафесіяналаў-менеджараў, пасрэднікаў, здольных працаваць на рынку свабодных папер, аказваць паслугі насельніцтву.

Стары памаўчаў. Што за біржы, якія на ёй таргі, а тым больш прафесіяналы-менеджары, ён ніколі да гэтага нават не чуў.

Па радыё перадалі яшчэ адну навіну:

— Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Мірачыцкі назваў галоўную праблему вяскоўцаў. Гэта недахоп грашовых сродкаў...

Дзед Фёдар пасля гэтых слоў дыктара ўхмыльнуўся і яхідна прамовіў сам сабе:

— А калі гэтых грашовых сродкаў у нашай сельскай гаспадарцы хапала?.. Ніколі... Як былі беднымі, так і засталіся... Недалёка ўжо да галечы...

Стары выказаўся ў кропку: Савецкі Саюз разваліўся, а ніякія істотныя рэформы ў калгасах і саўгасах не адбыліся. У калектывах гаспадарак па-ранейшаму выконвалі старыя, яшчэ савецкія ўказы, пастановы, інструкцыі, якія на корані душылі ўсякую ініцыятыву, усякае пачынанне. Ды і ва ўладзе заставаліся тыя ж самыя кадры, якія разлічвалі, як правіла, не на свае сілы, а на дзяржаўныя крэдыты, дзякуючы якім калгасы і саўгасы ледзь зводзілі канцы з канцамі. Аддаваць гэтыя крэдыты было неабавязкова, так як яны звычайна спісваліся. Надзея ў старога была на моладзь, новае мысленне, эфектыўныя формы гаспадарання...

«Такія, як Лёшка сёння патрэбны. Каб наперад ішлі. Прама, без аглядкі. А галоўнае — без мяшка мінулага за плячыма... Мяшка са смярдзючым, ды яшчэ крывавым рыззём...»

Успомніўшы ўнука, дзед Фёдар уздыхнуў з палёгкай, а калі выглянуў у акно, то нават павесялеў: «Усё-такі закапала з даху... Добра... Хутка затрашчыць на Чакве лёд, пойдзе гуляць рыба...»

Снег за апошнія дні прыкметна схуднеў. Ствалы дрэў як быццам заслязіліся, а вакол іх пазначыліся чорныя кругі, адкрываючы зямлю. Яе абходжвалі куры, якія адна за адной шумна пераляталі цераз платы двароў і накіроўваліся ў агароды, каб знайсці для сябе корм — свежую траву, чарвякоў, насякомых.

— Раскудахталіся, — ухвальна прамовіў дзед Фёдар. — Пайду, пагляджу...

Прырода ажывала, а разам з ёй ажывалі вуліцы і завулкі вёскі Рубеж, якія поўніліся людзьмі, узмацняўся гоман на іх,

Літаратурна-мастацкае выданне

**Разановіч** Анатоль Іванавіч

**ПАЛЫН-ВАДА**

Раман-хроніка

*Кніга трэцяя*
**Дробны дождж**

Рэдактар *Л. В. Пятроўская*
Мастацкі рэдактар *Н. Р. Агародная*
Тэхнічны рэдактар *Ж. М. Бароўская*
Карэктар *Л. В. Пятроўская*

16+

Падпісана да друку 25.01.2021. Фармат $60 \times 90^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 25,0. Ул.-выд. арк. 19,5. Тыраж 700 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь.
http://belarusbook.by

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «БудМедыяПраект».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/43 ад 03.10.2013;
№ 2/42 ад 13.02.2014.
Вул. В. Харужай, 13/61, 220123, Мінск, Рэспубліка Беларусь.